# Павысіць адказнасць за вылучэнне і выхаванне кадраў

## Н. АУХІМОВІЧ

Вялікая Айчынная вайна Совецкага Саюза завяршылася поўным разгромам гітлераўскай Германіі. Вораг разбіт і пастаўлен на калені. «З гэтага часу над Еўропай будзе развявацца вялікі сцяг свабоды народаў і міру паміж народамі» **(Сталін).**

У гэтай, амаль чатырохгадовай вайне супроць самага злога і подлага ворага, якога ведала гісторыя войн, — гітлераўскай Германіі, совецкі народ пакрыў сябе неўвядаемай славай. Масавы гераізм совецкіх людзей на фронце і ў тылу, самая высокая ў свеце арганізацыя дзяржаўнай і гаспадарчай дзейнасці ў годы вайны, пераўзыйдзенае воінскае майстэрства Чырвонай Арміі — усё гэта здабыла нашаму народу найвялікшую павагу перадавога чалавецтва.

Цяпер усяму свету ясна вялікая заслуга совецкага народа перад гісторыяй чалавецтва. Чырвоная Армія выратавала народы Еўропы ад нямецкіх захопнікаў, рабства і знішчэння.

> «З гэтага часу ўсе прызнаюць што совецкі народ сваёй самаадданай барацьбой выратаваў цывілізацыю Еўропы ад фашысцкіх пагромшчыкаў. У гэтым вялікая заслуга совецкага народа перад гісторыяй чалавецтва» (Сталін).

У Вялікую Айчынную вайну комуністычная партыя, выконваючы ўказанні таварыша Сталіна, падняла шырокія масы беларускага народа на свяшчэнную бітву супроць сваіх адвечных ворагаў — нямецкіх захопнікаў. Беларускі народ разам з рускім і іншымі народамі нашай краіны ўсюды непрымірыма змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Высокі гераізм, праяўлены нашымі людзьмі ў Айчыннай вайне, з'яўляецца вынікам той велізарнай работы з кадрамі, якую правяла наша партыя за годы мірнага будаўніцтва.

Таварыш Сталін вучыў:

> «Трэба, нарэшце, зразумець, што з усіх каштоўных капіталаў, якія ёсць у свеце, самым каштоўным і самым рашаючым з'яўляюцца людзі, кадры. Трэба зразумець, што пры нашых цяперашніх умовах «кадры рашаюць усё». Будуць у нас добрыя шматлікія кадры ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, на транспарце, у арміі — наша краіна будзе непераможна» [1].

Нашы партыйныя і совецкія кадры, наша інтэлігенцыя, акадэмікі, пісьменнікі, урачы, настаўнікі, рабочыя, калгаснікі, вырасшыя за годы сталінскіх пяцігодак, з чэсцю вытрымалі цяжкія выпрабаванні вайны з моцным і подлым ворагам і яшчэ больш згуртаваліся вакол большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна.

На свята Перамогі наш народ прышоў з усведамленнем выкананага абавязку ў Вялікай Айчыннай вайне.

Совецкая Беларусь вызвалена і адноўлена як дзяржава і заняла дастойнае месца сярод свабодалюбівых народаў свету.

---

[1] **Сталін,** «Пытанні ленінізма», стар. 491.

Цэнтральны камітэт партыі расстаноўку партыйных сіл у дні Айчыннай вайны праводзіў у імя перамогі над ворагам. Лепшыя свае кадры ён накіроўваў на самыя сур'ёзныя і адказныя ўчасткі. Толькі за перыяд вайны ЦК КП(б)Б падабраў, абучыў і накіраваў у тыл ворага са спецыяльным заданнем 13 515 камуністаў і камсамольцаў. Сярод іх вялікая колькасць кіруючых работнікаў.

Гэта забяспечыла паўсямеснае развіццё партызанскага руху ў тылу праціўніка і адначасова з'явілася велізарным укладам у справу падрыхтоўкі кадраў у партыйныя і савецкія органы на вызваленай тэрыторыі.

VI пленум ЦК КП(б)Б, які адбыўся 6 лютага 1945 года, вызначыў важнейшыя задачы КП(б) Беларусі на бліжэйшыя годы, задачы, накіраваныя на аднаўленне разбуранай немцамі народнай гаспадаркі рэспублікі і развіццё такіх галін прамысловасці, якія ператвораць нашу рэспубліку ў магутную індустрыяльную дзяржаву.

Мы павінны ў бліжэйшыя 2—3 гады аднавіць даваенныя размеры пасеўных плошчаў, дабіцца павышэння ўраджайнасці зернавых, бульбы і іншых сельскагаспадарчых культур і поўнасцю аднавіць у бліжэйшыя 3 — 4 годы грамадскую жывёлагадоўлю ў даваенных размерах. Ужо ў гэтым годзе пастаўлена задача аднавіць у калгасах усе жывёлагадоўчыя фермы.

Аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі патрабуе сур'ёзнага паляпшання ўсёй унутрыпартыйнай работы, павышэння бальшэвіцкай патрабавальнасці, напружання ў рабоце ўсіх звенняў партыйнага, дзяржаўнага і гаспадарчага апарата і павышэння адказнасці кожнага работніка за даручаны яму ўчастак работы.

Важнейшай умовай паспяховага выканання ўсіх гэтых задач з'яўляецца правільная работа па падбору, выхаванню, навучанню і расстаноўцы кадраў.

Ва ўсёй нашай рабоце неабходна памятаць указанне таварыша Сталіна, што «поспех справы залежыць ад арганізацыйнай работы, ад арганізацыі барацьбы за правядзенне ў жыццё лініі партыі, ад правільнага падбору людзей» [1].

На аддзелы кадраў абласных і раённых камітэтаў партыі, аддзел кадраў ЦК, работнікаў аддзелаў кадраў дзяржаўных органаў і гаспадарчых устаноў ускладзена велізарная задача—забяспечыць хуткае і правільнае вырашэнне ўсіх пытанняў у справе падбору, вылучэння і расстаноўкі кадраў.

Усякая марудласць, непаваротлівасць, несур'ёзны падыход да падбору работнікаў будзе тармазіць выкананне рашэнняў партыі.

Цэнтральны камітэт і абкомы партыі для работы ў партыйных, савецкіх і гаспадарчых органах, пасля вызвалення рэспублікі, вылучылі 53 тыс. партызан, у тым ліку 2219 чалавек, працаваўшых сакратарамі падпольных партыйных арганізацый, камандзіраў і камісараў партызанскіх брыгад і атрадаў. Сярод вылучаных на пасаду сакратароў РК КП(б)Б налічваецца 57 проц. партызан, 88 проц. ордэнаносцаў і 4 Героі Савецкага Саюза. Велізарную дапамогу ў камплектаванні партыйных і савецкіх органаў аказаў ЦК ВКП(б), накіраваўшы на пастаянную работу ў Беларусь вялікую колькасць вопытных партыйных, савецкіх, гаспадарчых і іншых работнікаў.

Для аднаўлення народнай гаспадаркі патрабуюцца шматлікія кадры. З прычыны гэтага пытанне вылучэння і навучання людзей на-

[1] **Сталін**, «Пытанні ленінізма», стар. 476.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

бывае ўсё больш актуальнае значэнне. Калі прыняць пад увагу, што 64 проц. дырэктароў прадпрыемстваў упершыню вылучаны на гэту работу і не маюць нават гадавога стажу кіруючай гаспадарчай работы, то стане відавочным, якая сур'ёзная задача стаіць перад аддзеламі кадраў, партыйнымі і гаспадарчымі кіраўнікамі па навучанню дырэктароў прадпрыемстваў. Пакуль што ў гэтых адносінах вельмі мала зроблена.

Такое-ж становішча мы маем і ў сельскай гаспадарцы. Толькі ў МТС 80,7 проц. дырэктароў працуюць на гэтай пасадзе ўпершыню. 7216 старшынь калгасаў вылучана на гэту работу на працягу апошняга года. Па ўсёй рэспубліцы налічваецца толькі 10 проц. старшынь калгасаў, маючых вопыт работы ад 3 да 10 год, і 47 старшынь калгасаў — звыш 10 год.

У мэтах аказання дапамогі і павышэння ведаў маладых вылучэнцаў ЦК КП(б) Беларусі ад 5 лістапада 1944 года прыняў пастанову аб правядзенні курсаў старшынь калгасаў. Палавіна ўсяго складу старшынь на працягу гэтай зімы прайшла адпаведнае навучанне. Аднак справай падбору старшынь калгасаў не толькі абкомы, але і многія райкомы не займаюцца па-сапраўднаму. У многіх раёнах яшчэ ёсць нецярпімая, парочная практыка, калі старшынь калгасаў падбіраюць і знімаюць усе, хто гэтага захоча, пачынаючы ад старшыні сельсовета і канчаючы любым работнікам раённых арганізацый і рознымі ўпаўнаважанымі райкомаў. Прычым ва ўсіх гэтых выпадках з калгаснікамі як пры падборы, так і пры замене старшынь калгасаў ніхто не раіцца.

Трэба рашуча выкараніць такую практыку, як у Віцебскай вобласці, дзе 80 проц. старшынь калгасаў на працягу апошняга года заменена, а ў 83 калгасах зменена па два старшыні за год. У Сіроцінскім раёне з 130 старшынь калгасаў зменена 99, у тым ліку 58 зняты, як не справіўшыяся з работай.

Ёсць абураючыя факты ў падборы старшынь калгасаў. Напрыклад, у Сіроцінскім раёне ў кіраўніцтва калгасам «Шлях Леніна» пранік стаўленік ворага Кібесаў, які ў часе акупацыі выдаваў немцам совецкіх людзей. Райком нават не ведаў, калі яго калгаснікі прагналі з калгаса.

У Талачынскі райком партыі зайшоў грамадзянін, нейкі Івашчанка, з дзесяткам планак ад ордэнаў і медаляў. Гэта прывяло ў такое замілаванне сакратара райкома па кадрах тав. Матарынкіна, што ён, не праверыўшы грамадзяніна, накіраваў яго на работу старшыні калгаса. Потым аказалася, што гэта авантурыст, які ніколі не служыў у Чырвонай Арміі, ніколі нікім не ўзнагароджваўся. Вядома, калгаснікі такога старшыню хутка выгналі.

Паданыя прыклады паказваюць, як яшчэ абыякава адносяцца ў паасобных раёнах да такой сур'ёзнай справы, як падбор, выхаванне і навучанне старшынь калгасаў.

За годы вайны беларуская партыйная арганізацыя выхавала тысячы работнікаў, даказаўшых у барацьбе з нямецкімі захопнікамі сваю адданасць нашай Радзіме і дастойных быць вылучанымі на кіруючую работу ў дзяржаўныя органы.

Лабанок Уладзімір Елісеевіч, вылучаны перад вайною першым сакратаром Лепельскага РК КП(б)Б, у часе Айчыннай вайны быў сакратаром падпольнага райкома КП(б)Б і камандзірам злучэння. За удзел у партызанскім руху ён атрымаў званне Героя Совецкага Саюза і ордэн Суворава 1-й ступені. У сучасны момант вылучан старшынёю Полацкага аблвыканкома.

Баранаў Фёдар Аляксеевіч да Айчыннай вайны працаваў трэцім сакратаром Баранавіцкага абкома КП(б)Б, у часе вайны быў сакратаром падпольнага абкома КП(б)Б і камандаваў партызанскім злучэннем, узнагароджан ордэнам Чырвонага сцяга, вылучан першым сакратаром Бабруйскага абкома КП(б)Б. Абласць добра спраўляецца з гаспадарча-палітычнымі задачамі.

Далідовіч Аляксандр Іванавіч да вайны быў старшынёю райвыканкома, у перыяд Айчыннай вайны—камандзірам партызанскага атрада, а потым брыгады. Тры разы ўзнагароджан, вылучан на работу нам. старшыні СНК БССР.

Тав. Рудчанка працаваў заг. райфінаддзелам Хойніцкага раёна, Палескай вобласці. У перыяд вайны быў камісарам партызанскага атрада, сакратаром падпольнага райкома. З дня вызвалення раёна працуе першым сакратаром Хойніцкага райкома партыі. Кіруе раёнам добра, раён у ліку перадавых.

Першы сакратар Бягомльскага райкома партыі тав. Манковіч да вайны працаваў сакратаром гэтага райкома па кадрах. У перыяд вайны быў камандзірам брыгады, сакратаром падпольнага райкома. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Умела арганізаваў работу па адбудове дамоў калгаснікаў. Зараз накіраван на вучобу ў вышэйшую школу партыйных арганізатараў пры ЦК ВКП(б).

Тав. Кечыла—старшыня Жэрабковіцкага сельсовета, Ляхавіцкага раёна, быў у партызанах. У перыяд працуе на кіруючай рабоце, але спраўляецца з ёю паспяхова. Прыцягвае да работы інтэлігенцыю сяла. У выніку пры сельскім савеце зараз працуе пяць пастаянна дзеючых камісій, і сельсовет лічыцца адным з перадавых у раёне.

Трэба смялей вылучаць на кіруючыя пасады здольных і ініцыятыўных работнікаў, праявіўшых сябе на рабоце, асабліва жанчын. Не баяцца таго, што з гэтымі маладымі работнікамі партыйным і савецкім кіраўнікам прыдзецца «павазіцца». Іншага шляху для вырашэння задачы падбору кіруючых работнікаў у нас няма.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі